**Параскевін, А.** Афганскі шлях камэска Шэдзько / А. Параскевін // Герой працы (Шуміліна). — 2012. — 14 лют. — С. 4.

## АФГАНСКІ ШЛЯХ КАМЭСКА ШЭДЗЬКО



Закончыўся вечар сустрэчы з выпускнікамі. Мы даўно ўжо старэйшыны, аднак маральная загартоўка шасцідзесятых спрацавала: на сустрэчу прыйшлі 13 былых вучняў нашых 10-х «А» і «Б». І гэта праз 45 гадоў!

Закончылі мы школу ў 1967 годзе. У тым далёкім 67-м палова нашых хлопцаў імкнуліся ў авіяцыю. Яно і зразумела: у Кукавячыне, што каля Віцебска, быў аэрадром, і штогод праводзіўся набор на курсы пілотаў-верталётчыкаў. У Даўгаўпілсе працавала ваенна-авіяцыйнае вучылішча. Вось і трое вучняў нашага 10 «Б» сталі авіятарамі. Сярод іх быў і Валерый Шэдзько. Лётную школу верталётчыкаў ён закончыў у 1969 годзе. Пасля размеркавання служыў у горадзе Сызрань, дзе экстэрнам здаў экзамен у лётным вучылішчы і атрымаў дыплом з адзнакай. У 1971 годзе стаў афіцэрам. З Сызрані малодшы лейтэнант Валерый Шэдзько быў пераведзены ў Сяміпалацінск. Там асвоіў баявую машыну Мі-2, стаў камандзірам экіпажа. Потым быў верталёт Мі-7, служба ў Германіі. У хуткім часе ён ужо камандуе экіпажам баявой машыны Мі-24.

«Гэта была сур’ёзная тэхніка з навейшым на той час узбраеннем», – успамінае ён. У 1979 годзе Валерыя Шэдзько пераводзяць у Хабараўск камандзірам эскадрыллі баявых верталетчыкаў. Камэск – хто з лётчыкаў незнаёмы з гэтай пасадай! Камэск – гэта і камандзір эскадрыллі, і настаўнік, і дарадчык, і бацька родны. Хутка гэта прыйшлося даказваць у сапраўдным баі. 1981 год. Афганістан. Яго эскадрылля знаходзілася ў гарах Шанданд. Баявыя вылеты і наземныя баі былі штодзень. У цяжкапраходных месцах, у гарах, сярод гарачых скал, у варожым акружэнні савецкага салдата не раз ратавала «вяртушка» На вайне як на вайне. «Выклікае камандзір палка, – успамінае Валерый Віктаравіч, – і аддае загад чатырма машынамі знішчыць групоўку ворага ў такім і такім квадраце. Вядучым прызначаю маёра Шэдзько.

Нарэшце 1989 год. Савецкія войскі выведзены з Афганістана. Валерый Шэдзько вяртаецца на Радзіму. Служыць у Баравусе-1 на пасадзе намесніка камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. У 1995 – ён ідзе ў адстаўку. На здароўі пілота Афганістан пакінуў значны след. А баявы летапіс Валерыя Шэдзько на ягоных грудзях: ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Дружбы народаў, шматлікія баявыя медалі.

**А. Параскевіч**